ПЕРАДАЧЫ ДА ДНЯ НАСТАЎНІКА 5

МЕСЦАМІ ЗАМАРАЗКІ... 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

4 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. ПЯТНІЦА № 194 (30328)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Таццяна КАРБАНОВІЧ, намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча:**

*«Пытанні забеспячэння насельніцтва айчыннай плодаагародніннай прадукцыяй знаходзяцца на пастаянным кантролі. На міжсезонны перыяд 2024—2025 гадоў плануецца закласці ў стабфонды 121,1 тысячы тон прадукцыі, у тым ліку бульбы — 46,9 тысячы тон, капусты — 20 тысяч тон, моркві — 12 тысяч тон, буракоў — 6,2 тысячы тон, цыбулі — 12,6 тысячы тон, яблыкаў — 23,4 тысячы тон. На прамысловую перапрацоўку плануецца адправіць каля 200 тысяч тон бульбы, 40 тысяч тон агародніны, 50 тысяч тон пладова-ягаднай прадукцыі. Акрамя таго, цяпер плодаагародніннай прадукцыя шырока рэалізоўваецца насельніцтву на сезонных кірмашах па цэнах вытворцаў. Экспертны патэнцыял ураджаю бульбы ацэньваецца прыкладна ў 300 тысяч тон, агародніны — 250 тысяч тон, яблыкаў — 60 тысяч тон».*

# Масты. Дарога. Машыніст

**Зрабіць якасныя дарогі — сапраўднае мастацтва, у якім машыніст катка Сяргей ВАЛЮКЕВІЧ ведае толк. Ён працуе ў філіяле ДРБУ № 208 горада Масты ўжо больш як 30 гадоў і мае пачэсны статус перадавіка працы.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Падзея

## МОДА БЕЗ МЕЖАЎ

### У Мінску адкрылася 48-я Міжнародная выстава «BTI-2024»

**Міжнародная выстава-кірмаш па аптовым продажы тавараў лёгкай прамысловасці — мерапрыемства, разлічанае ў першую чаргу на прафесіяналаў. Тут заключаюцца дамоўленасці аб супрацоўніцтве, падпісваюцца кантракты, абмяркоўваюцца актуальныя тэмы развіцця галіны, выступаюць знакамітыя спікеры.** СТАР. 4

З нагоды

## «ПЕДАГОГІКА — ПРЭСТЫЖНА І ГАНАРОВА»

### Што робіцца для таго, каб будучыя настаўнікі разумелі і адчувалі гэта

**У нядзелю ў краіне адзначаць Дзень настаўніка. Чалавека, які ва ўсе часы быў прыкладам для падрастаючага пакалення. Вядома, не толькі з-за свайго дзелавога касцюма, а яшчэ дзякуючы ўласным маральным каштоўнасцям, камунікабельнасці, эмпатычнасці, красамоўству, уменню бачыць і чуць, а таксама багатаму жыццёваму вопыту... Імідж настаўніка, усебаковае развіццё студэнтаў педагагічных ВНУ і новыя праекты — аб гэтым з нагоды прафесійнага свята ішла размова ў Нацыянальным прэс-цэнтры.** СТАР. 3

## КАРАТКА

- **У Беларусі з пачатку года адкрыліся 34 новыя аграсядзібы.**
- Акцыя «Цвярозы вадзіцель» пройдзе 4—6 кастрычніка ў Мінскай вобласці.
- **У Гродне хірургі выратавалі 98-гадовую пацыентку, выканаўшы ёй складаную аперацыю.**
- У нашай краіне плануецца распрацаваць Экалагічны кодэкс.
- **Ацяпленне ўключаюць у аб'ектах сацыяльнай сферы Гродна і Брэсцкай вобласці.**

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 24194

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЗАКРЫТЫХ ТЭМ У АДНОСІНАХ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І АЗЕРБАЙДЖАНАМ НЯМА»

## Прэзідэнт правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Азербайджана

**Гэтымі днямі дэлегацыя Азербайджанскай Рэспублікі на чале з кіраўніком урада Алі Асадавым знаходзіцца з афіцыйным візітам у Беларусі. Праграма візіту шырокая і насычаная. І пачалася яна ў Палацы Незалежнасці.**

### «НАШЫ АДНОСІНЫ — ГЭТА ПЕРАПЛЯЦЕННЕ МІЖДЗЯРЖАЎНЫХ І АСАБІСТЫХ СТАСУНКАЎ»

«Нягледзячы на рознага роду перыпетыі на міжнароднай арэне па нашых адносінах, паміж Беларуссю і Азербайджанам, вы і мой сябар, блізкі вельмі сябар і брат Ільхам Гейдаравіч (Аліеў, Прэзідэнт Азербайджана. — **«Зв.»**), павінны ведаць: закрытых тэм у адносінах паміж Беларуссю і Азербайджанам няма, — пачаў перагаворы Аляксандр Лукашэнка. — Пры гэтым мы не парушаем ніякія нормы міжнароднага права, мы не сябруем супраць трэціх краін. Мы робім сваю справу ў імя нашых народаў».

Па словах кіраўніка дзяржавы, гісторыя добрых, сяброўскіх адносін паміж Беларуссю і Азербайджанам доўгая. «Яшчэ з часоў Гейдара (Аліева, папярэдняга Прэзідэнта Азербайджана. — **«Зв.»**), з якім, нягледзячы на розніцу ва ўзросце, мы сябравалі, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Мы заўсёды знаходзілі ўзаемаразуменне і падтрымку. І я часта Ільхаму Гейдаравічу, цяперашняму Прэзідэнту, кажу: «Дзякуй богу, што нам з табой удалося захаваць той узровень адносін», які быў спрадвеку, можна сказаць, у нас з яго бацькам».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што прэм'ер-міністр Азербайджана таксама з'яўляецца блізкім чалавекам для Беларусі. Па словах Прэзідэнта, ён прадстаўляе краіну, з якой, як і з Расійскай Федэрацыяй, у нас склаліся найбольш блізкія і шчыльныя адносіны. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яму вельмі хацелася б, каб дамоўленасці, якія былі дасягнуты паміж Беларуссю і Азербайджанам падчас апошняга візіту беларускага лідара ў гэтую краіну, былі рэалізаваны.

Прэзідэнт паведаміў, што напярэдадні ў яго адбылася размова з прэм'ер-міністрам Беларусі з нагоды эканамічных пытанняў, узаемаадносін паміж дзвюма краінамі. «Ніякіх праблем няма, — падкрэсліў беларускі лідар. — Адзінае, што ён сказаў: «Пажадана, каб хутчэй». Гэта добра, што прэм'ер-міністр разумее: што трэба сёння хутчэй-хутчэй. Час такі. Калі ў выніку сённяшняга візіту і вашага знаходжання ў Беларусі мы знойдзем магчымасць паскорыцца, мы абавязкова паскорымся. Мы як прэзідэнты вам перашкаджаць не будзем».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, няма праблем паміж краінамі і на міжнародных пляцоўках. «Мы падтрымлівалі адно аднаго, падтрымліваем і будзем падтрымліваць, — заўважыў беларускі лідар. — Я вельмі ўдзячны ўраду Азербайджана і Прэзідэнту за тую каласальную падтрымку, якую яны нам аказваюць. Вы ведаеце, нашы адносіны — гэта перапляценне, добрае перапляценне, міждзяржаўных і асабістых стасункаў. Нашы асабістыя адносіны ўплецены ў палатно нашых міждзяржаўных адносін. І гэта садзейнічае таму ўзроўню, які мы маем па ўзаемаадносінах. Скажыце, што мы можам зрабіць для Азербайджана, — мы ўсё зробім. Так было дагэтуль, так будзе і далей. Упэўнены, што і Азербайджан для нас зробіць усё, на што ён здольны, бо так было заўсёды».

### «АСАБЛІВУЮ ЗНАЧНАСЦЬ МАЮЦЬ АДНОСІНЫ, ЯКІЯ СКЛАЛІСЯ ПАМІЖ ЛІДАРАМІ НАШЫХ ДЗЯРЖАЎ»

У сваю чаргу, прэм'ер-міністр Азербайджана перадаў Аляксандру Лукашэнку прывітанне і найлепшыя пажаданні ад Ільхама Аліева. «Ён даручыў мне перадаць сяброўскае і брацкае прывітанне», — канкрэтызаваў кіраўнік азербайджанскага ўрада.

Як падкрэсліў Алі Асадаў, паміж Беларуссю і Азербайджанам традыцыйна гістарычна склаліся спрыяльныя і сяброўскія адносіны. «Ільхам Гейдаравіч Аліеў, Прэзідэнт Азербайджанскай Рэспублікі, надае асаблівае значэнне адносінам з Беларуссю, — звярнуў увагу ён. — Гэта і традыцыйныя адносіны, якія склаліся, і тут асаблівую значнасць маюць адносіны, якія склаліся паміж лідарамі нашых дзяржаў — Ільхамам Гейдаравічам Аліевым і Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Мы, члены ўрады, з вялікім задавальненнем выконваем тыя даручэнні, якія паставілі перад намі нашы кіраўнікі».

Прэм'ер-міністр Азербайджана перадаў кіраўніку дзяржавы запрашэнне Ільхама Аліева наведаць Канферэнцыю ААН па змяненні клімату (COP29), якая ў лістападзе гэтага года адбудзецца ў Баку. Па словах Алі Асадава, асабісты ўдзел Прэзідэнта Беларусі на гэтай канферэнцыі надасць ёй асаблівы статус.

«Калі Ільхам гаворыць, значыць, будзем», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Алі Асадаў праінфармаваў, што задачы, пастаўленыя прэзідэнтамі Беларусі і Азербайджана ў рамках дзяржаўнага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Азербайджан у маі гэтага года, з'яўляюцца дарожнай картай для азербайджанскага ўрада. «Я размаўляў са сваім калегам, Раманам Галоўчанкам, ён таксама і ўрад Беларусі аналагічна гэта ўспрымае», — дапоўніў ён.

Прэм'ер-міністр Азербайджана паведаміў, што ў Беларусь прыехала вялікая дэлегацыя з гэтай краіны: міністры сельскай гаспадаркі і аховы здароўя, старшыня камітэта горадабудаўніцтва і архітэктуры, першыя намеснікі міністра МНС, міністра эканомікі, намеснік міністра замежных спраў і іншыя службовыя асобы.

Пасля перагавораў прэм'ер-міністра Азербайджана з Прэзідэнтам Беларусі ў Палацы Незалежнасці ў праграме візіту перагаворы Алі Асадава з прэм'ер-міністрам нашай краіны (у вузкім і пашыраным складах), падпісанне афіцыйных дакументаў і сустрэча кіраўнікоў дэлегацый з прадстаўнікамі СМІ. Таксама ў праграме візіту — наведванне кіраўнікамі ўрадаў Мінскага аўтамабільнага завода, дзе гасцям будзе прадстаўлена экспазіцыя беларускай тэхнікі, Гандлёвага дома Азербайджана і мікрараёна малапавярховай жылой забудовы «Новая Аколіца».

**Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# Зямельнае заканадаўства і пытанні маральнасці

## З чым прыйшлі грамадзяне на прыём да Ігара Сергяенкі

Фота БелТА.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Сергяенка правёў асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Палаце прадстаўнікоў.**

Анатоль Рыгоравіч з Мінска прапанаваў абмеркаваць сітуацыю, калі ва ўстановах адукацыі сталі шырока выкарыстоўваць тэрмін «законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў» замест звыклых усім «бацькі» ці «мама» і «тата». Таксама яго непакоіць мода на татуіроўкі ў маладых людзей і выкарыстанне нецэнзурнай лексікі. Мінчанін прапаноўвае заканадаўча замацаваць адказнасць за яе выкарыстанне ў грамадскіх месцах.

«Гэта пытанне чалавечай культуры, выхавання, — адзначыў Ігар Сергяенка. — З дзяцінства павінна прывівацца негатыўнае стаўленне да гэтага, тут бацькі прыклад падаюць».

Андрэй Мікалаевіч з Мінскага раёна просіць разгледзець яго прапанову аб увядзенні ў заканадаўства забароны на выкарыстанне зямельных участкаў, выдзеленых для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў і асабістых падсобных гаспадарак у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва менш за тысячу чалавек, для будаўніцтва стаянак і ангараў для велікагрузных аўтамабіляў.

«Я хадзіў па многіх інстанцыях са сваёй праблемай і ўсюды атрымліваю адмову, таму вырашыў звярнуцца на прыём у Палату прадстаўнікоў, — расказаў Андрэй Мікалаевіч. — Насельніцтва купляе ўчасткі, будуе сваімі сіламі дамы, а потым які-небудзь бізнесмен выкупляе найбліжэйшыя ўчасткі і ператварае населены пункт у прамысловую зону. Мне здаецца, гэта патрабуе ўрэгулявання».

«Гэтая праблема носіць дастаткова распаўсюджаны характар. Ваш дэпутат выедзе на месца і разбярэцца ў сітуацыі. Ёсць адпаведнае заканадаўства, Кодэкс аб зямлі. Напэўна, нешта трэба прадугледзець з улікам правапрымяняльнай практыкі», — падкрэсліў спікер.

Мінчанін Андрэй Фёдаравіч прапаноўвае ўнесці змяненні ў Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь у частцы аплаты падатку на дабаўленую вартасць пры фінансаванні аб'ектаў сельгаспрызначэння.

«Гэта пытанне патрабуе абмеркавання, наколькі яно актуальнае ў маштабах краіны», — адказаў Ігар Сяргеенка.

«Калі будзе льгатаванне па ПДВ, сельгаспрадпрыемствы і бюджэт ад гэтага выйграюць. Я задаволены тым, што мяне ўважліва выслухалі і што пытанне будзе далей абмяркоўвацца ў Палаце прадстаўнікоў», — пракаментаваў адказ заяўнік.

# ЗРАЗУМЕЛАЯ ПАЛІТЫКА

## Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар Сергяенка сустрэўся з дэлегацыяй Глыбоцкай раённай арганізацыі «Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў»

**Ігар Сергяенка пазнаёміў гасцей з дзейнасцю Палаты прадстаўнікоў і расказаў аб законапраектах, над якімі цяпер ідзе работа ў пастаянных камісіях.**

2 кастрычніка ў другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб змене законаў па пытаннях ветэранаў». Ён прадугледжвае комплексную карэкціроўку заканадаўства па пытаннях ветэранаў з улікам практыкі прымянення, неабходнасці актуалізацыі і ўпарадкавання катэгорый ветэранаў і льгот, прывілеяў і гарантый, якія даюцца ім і асобам, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, у тым ліку ў рамках гарманізацыі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Законапраект шырока абмяркоўваўся ў тым ліку з ветэранскай супольнасцю.

«Такога клопату аб ветэранах, як у нас, няма ні ў адной постсавецкай краіне. Ветэранам удзяляецца вялікая ўвага і Прэзідэнтам, і ўрадам, і дэпутацкім корпусам. Мы ўсім забяспечаны, а таксама маем магчымасць актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства», — расказаў журналістам старшыня Глыбоцкага раённага савета ветэранаў Віталь Шыпко.

Як адзначыў дэпутат па Докшыцкай выбарчай акрузе Анатоль Сіўко, такія сустрэчы вельмі важныя. «Сустрэча з выбаршчыкамі і работа ў акрузе — асноўныя задачы дэпутацкага корпуса. Чым больш мы, дэпутаты, будзем размаўляць з людзьмі, тым больш будзе зразумелым стаўленне нашых выбаршчыкаў да той палітыкі, якую праводзіць Прэзідэнт і ўрад», — падкрэсліў ён.

На асаблівым кантролі — работа са зваротамі грамадзян. «Многія пытанні вырашаюцца ў працэсе вядзення прыёму. Астатнія мы бяром пад кантроль і сумесна з зацікаўленымі службамі вядзём да вырашэння», — дапоўніў дэпутат.

**Паводле БелТА.**

Прызнанне

# «МАГЧЫМАСЦЬ РАСКАЗАЦЬ ПРА СВЕТ, ЯКІ Я ЛЮБЛЮ»

## Выстава «На роднай зямлі» адкрылася ў Палацы Незалежнасці

**Персанальная выстава бялыніцкай мастачкі Ларысы Журавовіч «На роднай зямлі» пры падтрымцы Беларускага саюза мастакоў разгарнулася ў галоўным адміністрацыйным будынку нашай краіны — у Палацы Незалежнасці. Экспазіцыя прымеркавана да штогадовага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі», у ёй прадстаўлена 27 работ, напісаных пастэллю на кардоне і ў змяшанай тэхніцы.**

Карціны прадстаўлены ў Зале ўрачыстых цырымоній. У многіх менавіта гэта памяшканне выклікае велізарнае ўражанне сваім маштабам: вышынёй столі (18 метраў), манументальным афармленнем, багаццем святла і бляскам пышных люстраў. Па словах Ларысы Віктараўны, для мастакоў велізарны гонар прадэманстраваць свае работы на такой значнай для нашай краіны пляцоўцы:

«Гэта вялікая адказнасць, таму што гэта ўсё ж такі адна з самых прадстаўнічых пляцовак. Мне вельмі хацелася б данесці сутнасць маіх работ да розных людзей. Гэта добрая магчымасць расказаць пра свет, які я люблю, — пра свет беларускай вёскі. Я вельмі спадзяюся, што сярод наведвальнікаў гэтыя работы знойдуць водгук. Калі б мае бацькі былі жывыя, яны б вельмі ганарыліся тым, што выстава адбылася тут, у Палацы Незалежнасці. Бо для кожнага мастака гэта рэдкая і цікавая магчымасць на такім узроўні паказаць сваю творчасць».

«Мяне натхняе малая радзіма, для мяне галоўнае — родны дом, мая сям'я, родная зямля. Я вельмі прывязаная да малой радзімы. Люблю вёску па-сапраўднаму, у тым ліку таму, што мае бацькі самі вясковыя. Для мяне гэта вельмі прыгожы і гарманічны свет, я ўсіх заклікаю пераехаць назад — у вёску. Я не ведаю лепшага ладу жыцця, чым працаваць на сваёй зямлі і жыць сярод прыроды».

Аўтар экспазіцыі «На роднай зямлі» вельмі занепакоеная тэндэнцыяй прасоўвання штучнага інтэлекту. На думку Ларысы Віктараўны, тэхнічны прарыў засланяе ўсе свае станоўчыя бакі галоўным негатыўным фактарам — заменай рэальнасці.

«Цывілізацыя і тэхнічны прагрэс патроху забіваюць і мяняюць рэальнасць, і мы губляем вельмі важнае — агульнасць з зямлёй, прыродай, адзін з адным. Мы становімся больш прагматычнымі. Мы сталі лічыць, што тэхнічны прагрэс — нешта карыснае, але гэта вельмі вялікая памылка. Калі я малюю, я пра гэта часта задумваюся. Мяне палохае ўваходжанне людзей у віртуальны свет. Я лічу, гэта ізаляванне чалавека самога ў сабе».

**Яўгеній КСЯНДЗОЎ, фота аўтара.**

# «ПЕДАГОГІКА — ПРЭСТЫЖНА І ГАНАРОВА»

### У НАСТАЎНІКА ЎСЁ ПАВІННА БЫЦЬ ПРЫГОЖЫМ...

Як заўважыла **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ,** педагог ва ўсе часы — гэта той чалавек, які валодае не толькі веданнем свайго прадмета, але і ўласным вобразам, маральнымі якасцямі, прафесіяналізмам і кампетэнтнасцю, з'яўляецца прыкладам для пераймання. Гэта заўсёды вобраз дзелавога чалавека ў строгім касцюме, з прычоскай, з усмешкай, які эмацыянальна і псіхалагічна ўстойлівы, стабільны, які ўмее шанаваць тое, што сёння мае, і вучыць гэтаму іншых.

### ГАРМОНІЯ, СТЫЛЬ, ДАСКАНАЛАСЦЬ

ВНУ, якія рыхтуюць настаўнікаў, прыкладаюць шмат намаганняў, каб выпускніцы не толькі прафесіянала ў пэўнай галіне педагогікі, але і асобу, грамадзяніна, здольнага да перадачы нацыянальна-культурных каштоўнасцяў і традыцый. Аб гэтым падрабязна расказала **начальнік цэнтра студэнцкай творчасці БДПУ Алена ЖУРАЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паводле яе слоў, адным з кірункаў дзейнасці вядучага ўніверсітэта па падрыхтоўцы педагагічных кадраў з'яўляецца стварэнне адукацыйнага асяроддзя для фарміравання ўсебакова развітой асобы. З гэтай мэтай ва ўніверсітэце рэалізоўваецца шэраг праектаў. Пра два з іх Алена Жураўская расказала падрабязна. Культурна-адукацыйны праект «Праз мастацтва — да культуры будучага педагога» рэалізоўваецца ўжо два гады. Ён накіраваны на грамадзянска-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі, захаванне нацыянальных каштоўнасцяў. Рэалізоўваецца па трох кірунках: музейным, тэатральным і экскурсійным. Праект прадугледжвае на рэгулярнай аснове наведванне студэнтамі тэатраў, музеяў. Арганізоўваюцца сустрэчы з акцёрамі, рэжысёрамі, студэнты маюць магчымасць убачыць закуліссе.

«Не так даўно запусцілі яшчэ адзін праект, які звязаны з гарманічным развіццём асобы нашых студэнтаў, — «Гармонія. Стыль. Дасканаласць», — расказвае кіраўнік цэнтра студэнцкай творчасці. — У назве закладзены тры ключавыя пазіцыі. У рамках рэалізацыі праекта праводзіцца серыя мерапрыемстваў, накіраваная на развіццё ўнутранага і знешняга складнікаў: выгляд педагога, самапрэзентацыя, паводзіны і шмат іншых важных кірункаў. Мы яго рэалізоўваем разам з Нацыянальнай школай прыгажосці».

### ВУЧЫЦЦА НА ПРЫКЛАДАХ

Безумоўна, выкладчыкі Нацыянальнай школы прыгажосці гатовыя ўносіць свой уклад, дапамагаць і дзяліцца ведамі з будучымі прафесіяналамі. Як паведаміла **дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці Бажэна ЯРЭМІЧ,** праект існуе каля года. Дысцыпліны звязаны з асновамі стылю, макіяжу, цырульніцкага мастацтва, маўленчага этыкету. На яе думку, гэта тыя веды, якімі павінны валодаць настаўнікі.

«Мы не плануем спыняцца, праект атрымаў станоўчую зваротную сувязь, таму будзем развівацца далей. Спадзяёмся, прынясём карысць».

Напярэдадні Дня настаўніка аб сваёй працы ў якасці маладога спецыяліста распавяла **настаўніца рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 52 г. Мінска, выпускніца БДПУ Таццяна РУДАЗУБ.**

«Я выбрала прафесію дзякуючы тым настаўнікам, якія ў свой час вучылі мяне. Іх стаўленне да дзяцей, падача матэрыялу мяне заўсёды ўражвала. Іх прыклад для мяне быў паказальны. Я адвучылася ў БДПУ, ва ўніверсітэце была вельмі ініцыятыўнай. Цяпер працую ў выдатнай школе, дзе падтрымліваюцца любыя ініцыятывы моладзі. Мне вельмі камфортна на сваім месцы. Настаўніцтва — стыль жыцця. І калі чалавек выбірае гэтую прафесію з жаданнем і любоўю да дзяцей, па-іншаму быць не можа. Сваім прыкладам я імкнуся паказаць, што педагогіка — прэстыжна і ганарова».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прамысловы спад пагражае аднаўленню эканомікі Японіі

У жніўні аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў Японіі скараціліся на 3,3 працэнта ў параўнанні з папярэднім месяцам, паведаміла Reuters са спасылкай на Міністэрства эканомікі, гандлю і прамысловасці краіны. Спад істотна пераўзыходзіць рынкавы прагноз, паводле якога чакалася скарачэнне на 0,9 працэнта. У прыватнасці, на 18,7 % месяц да месяца скарацілася вытворчасць абсталявання, на 10,6 % — аўтамабіляў. Прычынай паслужылі збоі ў рабоце прадпрыемстваў, выкліканыя тайфунам, а таксама слабы экспарт. Улады і аналітыкі паляпшэння сітуацыі не чакаюць, наадварот, папярэджваюць аб неспрыяльных перспектывах, якія акажуць ціск на эканамічны рост. Адзначаецца, што ў цэлым перспектывы экспартна-залежнай эканомікі азмрочваюць слабыя продажы ў ЗША і скарачэнне попыту ў Кітаі. «Улічваючы замежныя фактары, складана чакаць значнага росту вытворчасці ў найбліжэйшай будучыні», — адзначыў эканаміст Mizuho Securities Шунга Акімота.

### Італія і Швейцарыя змянілі граніцы ў Альпах з-за раставання ледавікоў

Дзве краіны скарэкціравалі горную граніцу ў Альпах, паведаміла The Guardian. Змяненні закранулі тэрыторыю вакол гары Матэрхарн, адной з самых высокіх у Еўропе. Вяршыня знаходзіцца на тэрыторыі швейцарскага курорта Цэрмат і італьянскай даліны Аоста. Улады дзвюх краін прыйшлі да дамоўленасці зыходзячы з эканамічных інтарэсаў. Змены, у прыватнасці, закранулі знакаміты гарналыжны курорт Цэрмат, бо Італія і Швейцарыя дамовіліся змяніць граніцу вакол славутасцяў Тэста Грыджыа, Плато Роза, Рыфуджа Карэль і Гоба ды Ролін. Па даных Швейцарскай акадэміі навук, летась ледавікі ў краіне страцілі 4 працэнты свайго аб'ёму. Акрамя таго, эксперты спынілі вымярэнне колькасці лёду на некаторых швейцарскіх ледавіках, бо яго там не засталося.

### Ілан Маск трэці год запар застаецца найбагацейшым чалавекам у ЗША

Амерыканскі прадпрымальнік Ілан Маск, нягледзячы на змяншэнне капіталу, трэці год запар застаецца найбагацейшым чалавекам у краіне, паведаміў Forbes. «Яго капітал ацэньваецца ў 244 мільярды долараў», — піша выданне. Пры гэтым дадаецца, што за апошні год прадпрымальнік «збяднеў» на 7 мільярдаў долараў. Другое месца ў спісе найбагацейшых амерыканцаў займае заснавальнік анлайн-рытэйлера Amazon Джэф Безас, яго багацце ацэньваецца ў 197 мільярдаў долараў. Трэцяе месца заняў заснавальнік Meta Марк Цукерберг, які ўзняўся ў спісе з восьмай пазіцыі летась. Яго багацце дасягнула 181 мільярда долараў дзякуючы рэзкаму росту кошту акцый кампаніі. Найбагацейшай амерыканкай застаецца адзіная дачка сузаснавальніка найбуйнейшай у свеце рознічнай гандлёвай сеткі Walmart Эліс Уолтан, яе багацце ацэньваецца ў 89,2 мільярда долараў. Усяго ў спіс найбагацейшых людзей ЗША па версіі Forbes уваходзяць 400 чалавек. Іх агульны капітал сёлета ацэньваецца ў 5,4 трыльёна долараў, што стала рэкордным паказчыкам.

# МОДА БЕЗ МЕЖАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

BTI і сёлета прадугледжвае вялікую дзелавую праграму, у тым ліку пасяджэнне грамадска-кансультатыўнага савета па развіцці прадпрымальніцтва, а таксама выступленне VIP-госця форуму Сяргея Сысоева, члена Асацыяцыі высокай моды і прэт-а-партэ Расіі, члена Міжнароднай асацыяцыі «Саюз дызайнераў». Але «BTI» — праект, прысвечаны не толькі тэхналогіям вытворчасці і прасоўвання тавараў лёгкай прамысловасці. BTI — гэта яшчэ і пра моду. Нават не так: гэта найперш пра моду! Пра стыль, творчасць і пачуццё прыгожага. Пра гэта казала, адкрываючы выставу, **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА:**

— Як бы нас ні ўспрымалі як пэўны працэнт ВУП, мы ўсё ж такі мода. І я б хацела пажадаць, каб лёгкую прамысловасць кожнай краіны, і нашай у прыватнасці, успрымалі як моду. Як прыгажосць і пачуццё стылю.

Галіна лёгкай прамысловасці шматгранная і шматпланавая, адзначыла Таццяна Лугіна. І гэтая галіна — часцінка бяспекі любой краіны, дадала яна.

— Мы ганарымся, што здолелі, нягледзячы на складанасці часу і рынку, захаваць, падтрымаць і сёння развіваем нашу тэкстыльную галіну, а разам з ёй развіваецца і швейная галіна — як буйны бізнес, так і ў апошнія гады (мяне гэта не можа не радаваць) эканамічна эфектыўна развіваецца малы бізнес, індывідуальнае прадпрымальніцтва, — звярнула ўвагу кіраўнік канцэрна «Беллегпрам». — У нас крэатыўная індустрыя, і маладыя дызайнеры, як хлопцы, так і дзяўчыны, дэманструюць выдатныя калекцыі як у межах праекта «Млын моды», так і на мностве іншых пляцовак.

## Асноўная тэма — якасць

Сёлета геаграфія выставы акрамя прадпрыемстваў нашай краіны — таксама Турцыя, Расія, Казахстан, Кыргызстан, Узбекістан. На цырымоніі адкрыцця прысутнічалі прадстаўнікі сферы лёгкай прамысловасці Індыі і Кітая.

— Асабліва хачу звярнуць увагу на краіны СНД, — падкрэсліла Таццяна Лугіна. — Мы канкурыруем не адзін з адным. Мы канкурыруем з сусветнымі лідарамі вытворчасці тавараў лёгкай прамысловасці. Ужо не першы год выбудоўваем адзіную стратэгію, каапераційную базу, вытворчыя ланцужкі, узаемна дапаўняючы адзін аднаго моцнымі бакамі кожнай краіны. Канструктыўна будуем зносіны, не адгароджваючыся і не бачачы адзін у адным канкурэнтаў.

Дарэчы, упершыню ў экспазіцыі BTI сёлета можна ўбачыць стэнд выставы Fashion Style Russia, які аб'ядноўвае ўсе галіны лёгкай прамысловасці і сегменты моды суседняй Расіі, а адным з яркіх фэшн-паказаў цырымоніі адкрыцця стала творчая калабарацыя вядучых швейных прадпрыемстваў Беларусі і Кыргызстана — «Світанак» і BigserSport.

Сёлета асноўная тэма BTI — якасць. Беларуская якасць сама па сабе даўно стала брэндам, і адзін з вынікаў работы BTI-2024 — рашэнне аб стварэнні ў нашай краіне нацыянальнага маркетплэйсу, дзе будуць прадстаўлены айчынныя вытворцы розных галін эканомікі (рабочая група ўжо сфарміравана). А адкрылася выстава паказам #МЫ ЯКАСЦЬ, дзе мадэлі брэндаў канцэрна «Беллегпрам» («Камволь», «Цэнтр моды», «Калінка») прадставілі медыйныя персоны Беларусі. На подыум выйшлі першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея Лазарэвіч, дырэктар тэлеканала «Мір» і старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга Шпілеўская, дырэктар інфармацыйнага агенцтва БелТА Ірына Акуловіч, арганізатар Рэспубліканскага конкурсу прыгажосці сярод шматдзетных жанчын «Краса Беларусі», шматдзетная маці Аляксандра Нікіфарава і сама Таццяна Лугіна (яна прадстаўляла брэнд «Цэнтр моды»).

## Аб куртках з падагрэвам і спажывецкіх перавагах

На BTI-2024 сваё бачанне прыгажосці і стылю дэманструюць больш за сотню экспанентаў. Як заўсёды, дызайнеры на крок наперадзе — у праграме форуму паказы калекцый сезонаў ужо будучага, 2025 года. Мы прагуляліся па экспазіцыі і высветлілі, што ў трэндзе і куды рухаецца мода.

Брэнд «Славянка» прадставіў на BTI-24 напярэдадні халадоў інавацыйныя куртакі з падагрэвам.

— Падагрэў працуе ад паўэрбанка, — тлумачыць **маркетолаг ААТ «Славянка» Валерыя САМАХВАЛАВА.** — Прадугледжаны тры рэжыму падагрэву. Награвальныя элементы праходзяць спераду вырабу і па спінцы. Ёсць жаночыя і мужчынскія мадэлі.

Мыць, дарэчы, такую куртку можна: у пральнай машынцы, папярэдне закрыўшы размешчаны ў кішэні провад спецыяльным каўпачком. Каштуе выраб каля 200 рублёў і, нядаўна прадстаўлены ў фірменных магазінах брэнда, ужо карыстаецца попытам, расказала суразмоўніца. Першапачаткова меркавалася, што такая куртка зацікавіць моладзь, але спадабалася ідэя і людзям сталага ўзросту, прычым у асноўным мужчынам.

— За рулём у тоўстым пухавіку няёмка, а наша куртка дастаткова тонкая, выйшаў з машыны — уключыў падагрэў: цёпла і камфортна, — кажа Вікторыя.

Акрамя інавацыйнай курткі, брэнд прадставіў калекцыі з экаскуры і экафутра, а таксама «пухнатую» вопратку з буклявanымі тканінамі, якая ўзыходзіць гэтай восенню на модны Алімп.

«Цэнтр моды» быў і застаецца ў моднай прасторы Беларусі сімвалам стылю і, так бы мовіць, элітарнасці.

— На 2025 год адзін з асноўных трэндаў, калі казаць аб святочнай групе, — асіметрыя, — адказвае **прадстаўнік кампаніі «Цэнтр моды» Ганна СЫЦЬКО** на стандартнае жаночае пытанне «Што будзе ў модзе?». — Але на выставе мы вырашылі ў першую чаргу прадставіць касцюмы.

Яна паказвае вырабы з цвіду:

— Ёсць касцюмы-»шанэлькі» (адсылка да класічных мадэляў Шанэль), ёсць варыянты з кароткім жакетам і доўгай спадніцай, прывезлі таксама сукенкі ў стылі Шанэль. Калекцыя ў трох колерах — чорны, блакітны і рыжовы.

Касцюмы са штанамі — «двойкі» і «тройкі» з камізэлькамі — брэнд прадставіў як у спакойнай колеравай гаме, так і ў яркіх тонах. Суразмоўніца распавядае, што брэнд аддае перавагу не пагоні за супертрэндамі, а падыходу «Стыль скрозь гады» — стварае высакаякасныя базавыя рэчы, якія стануць асновай гардэроба і праслужаць доўгія гады.

Вырабы Цэнтра моды належаць да цэнавай катэгорыі «вышэй за сярэднярынкавую», але гэта дызайнерскія вырабы, якія выпускаюцца ў маленькіх, лімітаваных калекцыях: рызыка, што вы сустрэнеце кагосьці ў такім жа ўборы, зводзіцца практычна да нуля.

— У нас шмат пастаянных кліентаў, якія зноў і зноў вяртаюцца па нашу якасць, — кажа Ганна.

Прынята лічыць, што на фоне вялізнай прапановы ў сегменце жаночай моды сегмент моды мужчынскай у беларускага легпрама крыху «прасядае». Але ў кампаніі «БелКрэда» запэўнілі: меркаванне гэта састарэла — сёння айчынныя брэнды здольныя стыльна адзець і мужчын.

— Не пагаджуся з тэзісам, што мужчынская мода ў нас не развіта, — кажа **прадстаўнік кампаніі «Белкрэда» Вікторыя ДУЧЫЦ.** — Так, для беларускіх брэндаў у мужчынскім сегменце характэрны акцэнт на класіку. Але ў гэтым сезоне менавіта класічныя мужчынскія касцюмы сталі трэндам. Мы прывезлі на выставу касцюмы ваўняныя і напаўваўняныя, з тканін ААТ «Камволь», у класічнай чорнай і сіняй колеравай гаме.

Вікторыя адзначае, што менавіта гэтыя колеры найбольш запатрабаваныя, калі аналізаваць продажы.

— Беларускія мужчыны носяць касцюмы, попыт на гэтую катэгорыю вырабаў стабільна высокі, — кажа яна.

І гэта, вядома, цешыць: мужчына ў касцюме — гэта прыгожа. Аддае перавагу моцная палова нашага грамадства класіцы: «Не завужанае, прамое» — такія запыты.

Што да колеравай гамы, шэрыя касцюмы чамусьці не надта зацікавілі пакупнікоў. Не спадабаліся нашым мужчынам і пінжакі ў клетку — яшчэ адзін трэнд сезона. Нашы мужчыны ў большасці дастаткова кансерватыўныя, адзначае Вікторыя. Гэта нядрэнна, але ўсё ж жанчынам не перашкодзіла б з імі папрацаваць для больш крэатыўнага ўспрымання моды і стылю.

Затое дызайнерам дзіцячага адзення з такой праблемай сутыкацца не даводзіцца: дзятва любіць прыбірацца, а беларускі легпрам — прыбіраць маленькіх моднікаў. Жлобінскі брэнд «Францішка» прадставіў на BTI мілую калекцыю зімовых куртачак яркіх колераў з экафутрам і далікатную пастэльную — куртачак дэмісезонных (да іх прадугледжаны аксэсуары ў тон).

— Дзецям патрэбен камфорт у рухах і натуральныя матэрыялы, а бацькі сочаць за тым, каб мадэлі былі ў рэчышчы моды, — тлумачыць прадстаўнік ААТ «Жлобінская швейная фабрыка» Ларыса Шанец. — Зыходзячы з гэтых прынцыпаў, і распрацоўваюцца новыя мадэлі.

Дзіцячае адзенне прывезлі на выставу ў Беларусь і ўзбекскія госці — кампанія Bonito kids.

— Наша перавага — суадносіны кошту і якасці, — распавядае прадстаўнік брэнда Дзмітрый Закіраў. — Ці канкурэнты нам беларускія вытворцы дзіцячага адзення? Безумоўна, у Беларусі ствараюцца вельмі якасныя, стыльныя калекцыі ў гэтым сегменце. Але гэта тая канкурэнцыя, якая карысная і нам, і вам — дапамагае абодвум бакам расці і развівацца.

## Ад «чыстай функцыянальнасці» да «чыстага мастацтва»

Выстава падрыхтавала пакупнікам шмат прыемных сюрпрызаў. Брэнды прапаноўваюць купоны на зніжкі ў сваіх фірмовых крамах, ААТ «Віцебскія дываны» стварыла чароўную фотазону з пухнатымі пуфікамі і мілай кучаравай авечкай, а фабрыка «8 сакавіка» ў першы дзень работы BTI раздавала жанчынам ружы пад дэвізам «8 сакавіка кожны дзень». Брэнд прывёз на выставу інавацыйную спартыўную калекцыю з высокатэхналагічных вільгацьадводных тканін.

— Сёння спартыўны стыль у трэндзе, а ў нашых талстоўках і худзі вам будзе цёпла, камфортна і проста ў звычайным жыцці, і — асабліва — падчас заняткаў спортам, — кажа **намеснік дырэктара па вытворчасці ААТ «8 сакавіка» Марына ГРАМЫКА.** — Бо, спацеўшы, у халодную пару года можна застудзіцца. У адзенні ад брэнда «8 сакавіка» вільгаць выводзіцца, скура і адзенне застаюцца сухімі.

Але, мабыць, самая ўражлівая частка экспазіцыі брэнда — адзенне для прафесійнага спорту. З прафесійнымі спартсменамі кампанія працуе ўжо не першы год. Адзявала і хакеістаў, і футбалістаў, і лёгкаатлетаў. Пра кожны выраб спецыялісты могуць расказваць доўга і вельмі цікава.

— Гэта форма для лёгкай атлетыкі. Ніжні слой падтрымлівае, верхні адводзіць вільгаць, — тлумачыць начальнік мастацка-эксперыментальнай лабараторыі Наталля Паўлава. — Вельмі важныя мяккія швы, гэта патрабаванне спорту. І высокая расцяжнасць тканіны — максімальная, якой можна дасягнуць... А гэта ўжо адзенне для хакея на траве, запыт быў для жаночай каманды. Пры стварэнні вырабу таксама выкарыстаны вільгацьадводныя палотны са светлагорскай сыравіны. Але, бачыце, тут іншая структура і шчыльнасць тканіны.

Адзенне для прафесійнага спорту — гэта не проста майка або джэмпер, шорты або легінсы. Гэта складаны сімбіёз эстэтыкі і навукі. Вырабы ствараюцца з тканіны рознай шчыльнасці: у месцах, якія патрабуюць большага вільгацеадвядзення, шчыльнасць адна, у іншых зонах — іншая. Не толькі тканіна, але і ніткі, якімі гэтая тканіна сшываецца, павінны валодаць павышанай расцяжнасцю, каб вытрымліваць нагрузку. Суразмоўніца адзначае, што гатовыя вырабы выпрабоўваюць у ходзе трэніровак прафесійных спартсмены, і адшліфуецца партыя толькі пасля адабрэння імі ўзораў.

Можна ўбачыць на BTI і непасрэдна дызайнерскія калекцыі — тыя, якія не прызначаны для паўсядзённага нашэння, а хутчэй да сферы «Я мастак, я так бачу». І не толькі на подыуме, але і ў экспазіцыі. Напрыклад, сваю калекцыю «Абрадвея» прадставіла пераможца «Млына моды» Святлана Івашына. Калекцыя прысвечана аўтэнтычным беларускім народным абрадам і ўпрыгожана ручной вышыўкай, прычым практычна кожны шывок тут мае сімвалічнае значэнне.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Новыя кадры

# У летняй школе «ПІН_КОДа»...

**Працягваецца навучанне, і хтосьці з сямі вучняў медыякласа, якіх абралі пасля першага этапу, — за крок ад мары трапіць на работу ў каманду канала «Беларусь 2». Аднак наперадзе яшчэ месяц стажыроўкі, дзе прэтэндэнты працягнуць спасцігаць тонкасці журналістыкі.**

Нагадаем, адбор для ўдзелу ў рэаліці «Летняя школа ПІН_КОД» з больш чым 100 прэтэндэнтаў прайшлі 17 чалавек. На працягу некалькіх месяцаў яны вывучалі тэхнікі стварэння відэасюжэтаў і этапы падрыхтоўкі праграмы, наведвалі майстар-класы ад дзеючых аўтараў, карэспандэнтаў і вядучых, спрабавалі сябе ў ролі карэспандэнтаў. А па выніках выкананых творчых заданняў кожны тыдзень праект пакідаў адзін з удзельнікаў, які атрымліваў найменшую колькасць балаў. Варта адзначыць, што на лёс гэтых людзей уплывалі і тэлегледачы.

І толькі сем самых здольных і амбіцыйных пачынаючых журналістаў атрымалі шанц змагацца далей і працягнулі вучобу ў баявым рэжыме ў «Летняй школе ПІН_КОДа». Яны на працягу найбліжэйшага месяца будуць здымаць сюжэты для праектаў тэлеканала «Беларусь 2». А пасля заканчэння стажыроўкі вызначаць тых, хто трапіць у творчую каманду маладзёжнага праекта «ПІН_КОД». За новымі поспехамі прэтэндэнтаў тэлеаўдыторыя па-ранейшаму можа назіраць у дзённіках рэаліці «Летняя школа ПІН_КОД» у эфіры тэлеканала «Беларусь 2».

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 208

Мінчанін Міхаіл Кошаль даслаў нам палепшаную версію даўняй задачы А. Гансера 1896 года ***(гл. дыяграму)***.

**Белыя:** Крg7, Фс2, Лb3, Ле1, Cd6, Kd3, Kf5, пb2 (8).
**Чорныя:** Крd5, Кс3 (2).
Мат за два хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Будапешце прайшла 45-я сусветная шахматная Алімпіяда з удзелам 188 мужчынскіх і 169 жаночых каманд (у заявачных спісах іх было больш, але прыехалі не ўсе). У мужчын зборная Індыі выйграла 10 матчаў пры 1 нічыёй. На другім месцы — ЗША, на трэцім — Узбекістан (па 8 перамог, 2 пройгрышы і 1 нічыёй). Такі ж вынік, але горшыя дадатковыя паказчыкі, у Кітая, Сербіі і Арменіі. Месцы з сёмага да дзясятага занялі адпаведна Германія, Азербайджан, Славенія і Іспанія.

У жанчын залатыя медалі заваявала таксама Індыя (+9-1=1). «Серабро» — у Казахстана, «бронза» — у ЗША (амерыканкі па дадатковых паказчыках апярэдзілі шахматыстак Іспаніі, Арменіі і Грузіі). На месцах з сёмага да дзясятага — Кітай, Украіна, Польшча і Балгарыя.

* * *

Беларуская федэрацыя шахмат правяла анлайн-турнір (54 удзельнікі): 1) Дзяніс Лазавік — 9 балаў з 11; 2-3) Арцём Сіняўскі і Сяргей Жыгалка — па 8,5 бала. Найлепшы вынік сярод жанчын у Юліі Лявонавай.

У Маскве на пятым Кубку Міхаіла Бацвінніка, дзе гросмайстры-капітаны давалі сеансы адначасовай гульні дзіцячым камандам сапернікаў, беларуская зборная заняла другое месца. За яе выступалі Міхаіл Нікіценка (капітан), Мацвей Савельеў, Радзівон Сідарэня, Дамір Булгак і Вераніка Абрамкіна. У чатырох папярэдніх такіх турнірах, дарэчы, беларусы двойчы былі першыя.

У двух турнірах у індыйскім горадзе Каімбатар Яўген Падольчанка заняў 1-е і 4-е месцы.

У турнірах па бліцы на сайце chess.com Дзяніс Лазавік заняў 10-е месца з 521, 6-е — з 757 і 15-е — з 508, а Сяргей Жыгалка — 33-е — з 508.

* * *

Прапануем тры партыі з сёлетніх чэмпіянатаў Беларусі.

Аляксей Аляксандраў — Цімур Гвоздзеў. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. h3 0-0 6. Ce3 c5 7. Kf3 cd 8. K:d4 b6 9. Ce2 Cb7 10. Фс2 Kbd7 11. 0-0 e6 12. Лfd1 Фе7 13. a4 Kc5 14. Cf3 a5 15. Лd2 Лad8 16. Лad1 Ke8 17. Kb3 Kc7 18. e5 C:e5 19. C:b7 K:b7 20. C:b6 Лa8 21. Kd4 Cg7 22. Фe4 Ka6 23. Kdb5 Kac5 24. Фe3 Фh4 25. K:d6 Kb3 26. K:b7 K:d2 27. Л:d2 Ch6 28. Фd4 Фe7 29. Фd7 Фb4 30. Cc5 Фb3 31. Лe2 Лfc8 32. K:a5 Фb8 33. Kc6 Фc7 34. Ke7+ Крh8 35. Cd4+ Cg7 36. C:g7+ Кр:g7 37. Фd4+, 1:0.

Арцём Бяляўскі — Максім Царук. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. g3 d5 4. Kf3 Cb4+ 5. Cd2 a5 6. a3 Ce7 7. Cg2 0-0 8. Фc2 c6 9. 0-0 Kbd7 10. Cf4 b6 11. Kbd2 Ca6 12. Лac1 Kh5 13. Ce3 Khf6 14. Cf4 Лc8 15. Фb1 c5 16. dc bc 17. e4 d4 18. e5 Kh5 19. Ke4 K:f4 20. gf Ле8 21. Ked2 Лb8 22. Ke1 f5 23. ef6 K:f6 24. Kd3 Cd6 25. Лce1 Kh5 26. Фd1 K:f4 27. K:f4 C:f4 28. Ke4 C:c4 29. K:c5 C:h2+ 30. Кр:h2 C:f1 31. K:e6 Фd6+, 0:1.

Аляксандра Тарасенка — Вікторыя Дорашава. 1. e4 e6 2. d4 d5 3. e5 c5 4. c3 Kc6 5. Kf3 Фb6 6. Cd3 cd 7. 0-0 Cd7 8. Kbd2 dc 9. bc Kge7 10. Фe2 Ka5 11. Лb1 Фc7 12. Kb3 K:b3 13. Л:b3 Kc6 14. Cf4 Ka5 15. Лbb1 a6 16. h4 b5 17. h5 h6 18. Cg3 Ce7 19. Лbc1 Kc4 20. Kd4 Cc5 21. Фg4 0-0 22. Лfe1 Лfe8 23. Cf4 Крh8 24. Фf3 Лf8 25. Лc2 b4 26. Лce2 bc 27. C:h6 K:e5 28. Л:e5 gh 29. Фf6+ Крg8 30. Лg5+ hg 31. h6, 1:0.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Kd4! Правільна адказалі Ігар Ананіч, Міхаіл Кошаль, Леанід Шацько, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





Сядзі і глядзі

# НАСТАЎНІКАМ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...

**Тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі запланавалі радаваць аўдыторыю тэматычнымі эфірамі да Дня настаўніка, які ў краіне традыцыйна адзначаем у першую нядзелю кастрычніка. У праграме — гульнявыя кінастужкі, спецыяльныя выпускі праграм і святочныя канцэрты.**

Так, 5 кастрычніка на тэлеканале «Беларусь 1» у 15.50 выйдзе тэматычны выпуск праекта «Адзін дзень», які будзе прысвечаны Жодзінскай гімназіі. Галоўная гераіня — настаўніца біялогіі з 20-гадовым вопытам Анжэла Анатольеўна Жаляк. Яна раскажа пра выхаванне і навучанне дзяўчат у гімназіі, аб гісторыі і значэнні захавання традыцый. Сярод якіх, напрыклад, тая, што дзяўчаты гімназіі на выпускным балі танцуюць з хлопцамі з Сувораускага вучылішча.

А ў дзень свята, 6 кастрычніка, выйдзе 4-серыйная мелодрама «Маё сэрца з табой» — кранальная гісторыя простай настаўніцы матэматыкі. Жанчына разыходзіцца з мужам і застаецца адна з дачкой Ленай. Але самае страшнае выпрабаванне ў яе жыцці гераіні пачынаецца, калі яе дзяўчынка пачынае цяжка хварэць...

Акрамя гэтага, у 17.20 на першай кнопцы гледачоў чакае паказ тэлеверсіі святочнага канцэрта прысвечанага Дню настаўніка.

У эфіры сацыякультурнага тэлеканала 6 кастрычніка ў 14.05 прагучаць знаёмыя кожнаму са школьных гадоў музычныя кампазіцыі і шчырыя словы віншаванняў, удзячнасці ў адрас педагогаў. І ўсё тое ўбачым у тэлеверсіі святочнага канцэрта да Дня настаўніка, які арганізоўваўся ў мінулым годзе.

Працягнецца тэматычны эфір на тэлеканале «Беларусь 3» паказам мастацкага кінафільма «Расклад на паслязаўтра» (1978 г.) рэжысёра Ігара Дабралюбава. Гісторыя настаўніцы літаратуры Антаніны Сяргееўны, якая імкнецца патлумачыць вучням спецыялізаванай фізіка-матэматычнай школы, што жыццё большае за дакладныя матэматычныя формулы, а літаратура і мастацтва вельмі важныя ў выхаванні маладых людзей.

Дню настаўніка будзе прысвечана і вячэрняя перадача для самых маленькіх «Калыханка». У 20.40 юным гледачам прапануюць новую павучальную гісторыю з любімымі героямі і прагляд мультфільма «Як верблюдзяня і ослік у школу хадзілі».

**Алена ДРАПКО.**

**Смачная восень са «Звяздой»!**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года, запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 24 кастрычніка 2024 года (па паштовым штэмпелі атрымання) у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем сокавыціскалак Kitfort KT-1150-1 і суперпрыз — сушылка для агародніны і садавіны Kitfort KT-FP-1940.

Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 4 лістапада 2024 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года. Пасля 31 снежня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 167 ад 28 жніўня 2024 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 1.12.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
*(аддзяленне сувязі)*
на IV квартал або на II паўгоддзе 2024 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
*(абавязкова)* *(індэкс)*

**Удачы ў розыгрышы!**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.25** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.20, 22.05** Зона Х (16+).
**8.50** Слова Архіепіскапа Юзафа Станеўскага на ўрачыстасць Маці Божай Разарыя.
**9.20** Галоўны эфір.
**10.55, 12.25 Меладрама «Цётка Таня» (12+).**
**13.10, 15.25 Меладрама «Выбіраючы сябе» (12+).**
**15.15, 18.45** Навіны рэгіёна.
**17.45** Беларуская часінка.
**19.10 Меладрама «Сняданак у ложак» (12+).**
**20.55** «Фактар.BY».
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.
**22.25 Серыял «След» (16+).**

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.10** Наш час.
**10.15** «Жыць здорава!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10** «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15, 22.55 Фільм «Сэрца маці» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Прапаганда» (16+).
**21.40 Фільм «Адно жыццё на дваіх» (12+).**
**0.55** «Спартклуб» (16+).
**1.15** Час.
**2.00** Заканчэнне эфіру.

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.20** «Слова і справа».
**10.40** Дак. праект «Без падману» (16+).
**13.50, 0.50 «Стажоры». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Хуткая дапамога-5». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «Дзермант. Сэнсы».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Неўскі». Серыял (16+).**
**23.05** «СТБ-спорт».
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

## МІР

**5.00, 6.15 Тэлесерыял «Шчыт і меч» (16+) (з субцітрамі).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**6.45, 0.20** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**8.50, 10.20 Маст. фільм «Чын-гачгук — Вялікі Змей» (16+).**
**10.10** «Беларускі стандарт» (12+).
**11.00 Маст. фільм «Белыя ваўкі» (16+).**
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.45** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**22.30 Маст. фільм «Выйсці замуж за капітана» (16+).**
**0.55** Першы Еўразійскі канал (12+).
**2.10 Тэлесерыял «Зорге» (16+).**

## Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05** Галоўны эфір.
**5.20, 6.30, 7.35, 8.35, 9.35, 14.40** Навіны эканомікі (12+).
**5.30, 6.25, 7.45, 8.45, 9.45, 14.50, 16.50, 0.15, 2.10, 3.10, 4.10** Дзень спорту.
**5.35, 6.35, 7.50, 8.50, 9.50, 13.55** Прэс-агляд.
**5.40, 6.40, 10.50** Меркаванне клуба (12+).
**5.55, 7.55, 9.55** Сусветная навука.
**6.00, 0.00** Гімн.
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 13.00, 14.00, 16.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**8.40, 9.40, 10.45, 11.30, 12.00, 12.30, 13.35, 14.35, 15.00, 15.45, 16.35, 17.40, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 22.55, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**10.05, 15.05** Вакол планеты (12+).
**11.05, 16.10, 21.15** Тэлефільм (12+).
**11.35, 21.45, 23.10, 3.30** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**12.05, 14.05, 1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).
**12.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**13.40, 17.45** Твой горад (12+).
**15.50, 20.20, 0.50, 3.50** Громаў LIVE.
**16.45, 18.50, 19.50, 21.40, 22.45** Аператыўна (16+).
**18.00** Навіны рэгіёна.
**18.25, 23.25, 4.30** Арэна (12+).
**19.30, 20.35, 22.15, 0.20, 1.15, 2.15, 3.15, 4.15** Сфера інтарэсаў (12+).
**20.05, 0.35** Зразумелая палітыка (12+).
**22.30** Спецыяльны рэпартаж (12+).

## РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05, 9.05** «Новая раніца».
**10.05 Тэлесерыял «Асінае гняздо» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Акцэнты».
**12.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**13.45** «Плюс-мінус».
**14.40 Тэлесерыял «Тайны следства» (12+).**
**15.30** «60 хвілін».
**17.40** «Ёсць пытанне» з Вадзімам Гігіным.
**18.45** «Малахаў» (16+).
**21.30, 23.15 Тэлесерыял «Люцік і Анюцік» (16+).**
**23.55** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Беларусы (6+).
**6.50** «Навука побач» (6+).
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** Беларуская супержанчына.
**8.30, 10.35 Фільм «Двое на востраве слёз» (16+).**
**10.55 Камедыя «Кіношнікі» (12+).**
**12.30** Таямніцы следства (12+).
**13.20, 22.45, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** «За гранню» (16+).
**14.55** «ДНК» (16+).
**16.30, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.45 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15, 21.40 Серыял «Неўскі. Блізкі вораг» (16+).**
**21.25** «НЗ.by».
**22.50, 23.45 Серыял «Баршчы» (16+).**

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.00, 17.05, 20.30, 22.40** «Навіны культуры».
**8.15, 21.05 «СМЕРШ. Дарога агню». Маст. фільм (16+).**
**9.55** «Культурны тыдзень».
**10.30, 19.20 «Месца сустрэчы змяніць нельга». Маст. фільм (12+).**
**11.45** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.35** «Жывая спадчына».
**13.10, 22.50 «Андрэй Рублёў». Маст. фільм (16+).**
**16.15** «Наперад у мінулае».
**16.40** «Навука побач» (6+).
**17.15 «Цешча». Маст. фільм (12+).**
**18.25** «Праўдзівая гісторыя Тутанхамона». Дак. фільм (12+).
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**6.30** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Акрон» (Тальяці) — ФК «Ніжні Ноўгарад».
**8.30** Вынікі тыдня.
**9.10** Дзюдо.
**10.30** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**11.10** Пляжны футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2025. Англія — Грузія.
**12.25** Пляжны футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2025. Эстонія — Казахстан.
**13.35** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Лакаматыў» (Масква) — «Крылы Саветаў» (Самара).
**14.55, 23.05** Пляжны футбол. Кваліфікацыя да ЧС-2025. Беларусь — Малдова.
**16.10** Між іншым.
**16.30** На спорце.
**16.50** Хакей. КХЛ. «Аўтамабіліст» (Екацярынбург) — «Барыс» (Астана). У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**19.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Лакаматыў» (Орша). У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**21.40** На мяжы фолу. Футбольны агляд.
**0.10** Петанк. Кубак Беларусі.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 14.00, 17.05** Тэлебарометр.
**10.05 Дэтэктыў «Сем мінус адзін» (16+).**
**13.30** Я з вёскі (12+).
**14.30** «Дзіця з пекла» (16+).
**15.50** «Конь Юлій і вялікія скачкі» (6+).
**17.10** Смачна есці (12+).
**17.55** «Сляпая». Дак. драма (16+).
**18.25 Дэтэктыў «Марозава» (16+).**
**20.15 Серыял «Ніна» (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
